УДК 94:327(4-11)’’16’’

**С. А. Чаропка**
*ГДУ ім. Ф. Скарыны, г. Гомель*

# МІЖНАРОДНАЯ СІТУАЦЫЯ ВА УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ Ў 20–40-Х ГАДАХ XVII СТАГОДДЗЯ

*У артыкуле разглядаецца міжнароднае становішча ва Ўсходняй Еўропе ў 20–40-х гадах XVII ст., вылучаюцца асноўныя вузлы супярэчнасцяў паміж Рэччу Паспалітай, Швецыяй, Асманскай імперыяй і Расійскай дзяржавай. Аўтар праводзіць даследаванне ўплыву знешнепалітычных фактараў на працэс разгортвання казацка-сялянскай вайны на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. У выніку работы аўтар прыходзіць да высновы, што складаная знешнепалітычная сітуацыя, у якой аказалася Рэч Паспалітая ў сярэдзіне XVII ст., стварыла спрыяльную кан’юктуру для актывізацыі апазіцыйных каралеўскаму ўраду сіл і пачатку глыбокага ўнутрыпалітычнага крызіса, які істотна паўплываў на геапалітычную сітуацыю ва Ўсходняй Еўропе.*

У першыя два дзесяцігоддзя XVII ст. геапалітычная сітуацыя ва Ўсходняй Еўропе істотна змянілася. Унутрыпалітычны крызіс у Расійскай дзяржаве, вядомы ў гістарыяграфіі пад тэрмінам “Смута”, дазволіў істотна ўзмацніць свае пазіцыі ў рэгіёне Рэчы Паспалітай і Швецыі. Сталбоўскі мір 1617 г. паміж Расіяй і Швецыяй фактычна пазбавіў Маскву выхада да Балтыйскага мора, а Дэўлінскае перамір’е 1618 г. замацавала за Рэччу Паспалітай страчаныя Масквой яшчэ ў 1610–1610 гг. Смаленшчыну і Севершчыну [1]. Нягледзячы на ўзрастанне цікавасці грамадства да беларускай гісторыі перыяду XVII ст. значнай гістарыяграфічнай спадчыны па абазначанай у назве праблеме гісторыкі яшчэ не пакінулі. Сур’ёзны задзел у гэтым накірунку зрабіў беларускі гісторык У. Снапкоўскі. Даследаванні замежных навукоўцаў дэманструюць пераважна агульную карціну міжнародных адносін вывучаемага часу, або тэма разгледжана праз прызму ўласнай нацыянальнай гісторыі [2]. Такім чынам, для вывучэння абазначанай тэмы існуе яшчэ вялікі патэнцыял.

У барацьбе за спадчыну Старажытнай Русі паміж Масквой і Вільняй, якая распачалася яшчэ ў канцы XV ст і трываўшая ўсё XVI ст., здавалася змяніліся суадносіны сіл. Але барацьба за кантроль над усходняй Прыбалтыкай, якая ў 1600 г. натуральным чынам разгарнулася паміж новымі лідэрамі – Швецыяй і Рэччу Паспалітай, далі магчымасць Расійскай дзяржаве аднавіць свае сілы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Актыўны ўдзел Рэчы Паспалітай у Дзмітрыядзе, а таксама вяртанне ў склад ВКЛ і Польшчы страчаных раней Смаленшчыны і Севершчыны не мог пакінуць расійскае кіраўніцтва ў спакоі. Абсалютна заканамерна, што Расійская дзяржава крыху ачуняўшы пасля Смуты, стала рыхтавацца да рэваншу. Для гэтага склаліся неабходныя ўмовы – няўдачны паход кароннай арміі на чале з каралевічам Уладзіславам 1617-1618 гг., зацягнуўшаяся вайна Рэчы паспалітай са Швецыяй і няпростыя ўзаемаадносіны Рэчы Паспалітай з Асманскай імперыяй.

У вайне са Швецыяй удача таксама аказалася не на баку польска-літоўскага войска. У 1620 і 1626 гг. шведскі бок прапаноўваў Маскве сумесныя баявыя дзеянні супраць Рэчы Паспалітай. У 1621 г. з падобнай ініцыятывай выступала Асманская імперыя. Аднак расійскае кіраўніцтва, разумеючы, што спачатку трэба аднавіць патэнцыял, страчаны падчас Смуты, праводзіла вельмі асцярожную знешнюю палітыку.

Тым часам, міжнароднае становішча Рэчы Паспалітай пастунова стала пагаршацца. У 20–40-х гг. XVII ст. Цэнтральная Еўропа прадстаўляла сабой суцэльны тэатр баявых дзеянняў Трыццацігадовай вайны. У ходзе гэтай вайны аформіліся дзве міжнародных кааліцыі, першую з якіх уяўляла Каталіцкая ліга, аснову якой складалі паўднёвагерманскія княствы Свяшчэннай Рымскай імперыі і Іспанія; другой групоўкай з'яўлялася Евангелічная унія, прадстаўленая Даніяй, Швецыяй і Францыяй. Падчас Трыццацігадовай вайны Рэч Паспалітая, захоўваючы нейтралітэт, пайшла на збліжэнне з Габсбургамі, падтрымлівала іх на дыпламатычным полі, давала магчымасць для набору дабраахвотнткаў.

У прыватнасці, у 1620–1621 гг. разгарнулася г.зв. Хоцінская вайна паміж Польска-Літоўскай дзяржавай і Асманскай імперыяй, якая была пабочным элементам Трыццацігадовай вайны. Узброенны канфлікт Рэчы Паспалітай і Асманскай імперыяй быў выкліканы разгромам у 1619 г. атрадам наёмнікаў-лісоўшчыкаў з Рэчы Паспалітай войск Трансільваніі каля Гумені. Такім чынам варшаўскі ўрад выратаваў ад падзення аточаную трансільванцамі Вену. Трансіванскі князь Дзьёрдзь Ракацы звярнуўся за дапамогай да свайго сюзэрэна – асманскага султана Асмана II. У той жа час ўрад Порты падазраваў польска-літоўскае кіраўніцтва ў імкненні замацавацца ў Малдове, якую асманы разглядалі як сферу свайго ўплыву. Сапраўды ў 1620 г. гаспадар Малдовы Гаспар Грацыяні перайшоў на бок Рэчы Паспалітай. Такім чынам, разгарэлася вайна Асманскай імперыі

супраць Рэчы Паспалітай, прадчас якой, у выніку двух бітваў (пад Цэцорай і і Хоцінам) стала зразумела, што абодва бакі імкнуцца захаваць статус кво. Хоцінскі мірны дагавор 1621 г. фактычна зафіксаваў адмову польска-літоўскага боку ад прэтэнзій ў адносінах да Малдовы, але разам з тым, асманская экспансія была на пэўны час спынена. [4]. Пры гэтым, як сведчаць крыніцы, польскім дыпламатам давялося шмат папарацаваць, каб асманскі бок выконваў пункты дагавору [5].

Няўдала для Рэчы Паспалітай складывалася вайна са Швецыяй, якая была распачата яшчэ ў 1600 г. Перамогі шведаў паставілі пытанне аб трываласці Рэчы Паспалітай як федэратыўнай дзяржавы. Заключаны ў 1627 г. Вялікім княствам Літоўскім сепаратны мір са шведамі паставіў Польшчу у цяжкую сітуацыю і садзейнічаў заключэнню ў 1629 г. Альтмаркскага замірэння, паводле якога Рэч Паспалітая пазбавілася значных уладанняў у Інфлянтах. У наступным, Л. Сапегу за заключэнне гэтага перамір'я даводзілася апраўдавацца перад каралём Жыгімонтам ІІІ, успамінаючы, як фактар апраўдання, актыўны ўдзел войска ВКЛ у Хоцінскай вайне [6, с. 97].

Фармальна не ўдзельнічаючы ў Трыццацігадовай вайне Рэч Паспалітая, ваюючы з Швецыяй аказвала ўскосную дапамогу Габсбургам. У сувязі з гэтым, завяршэнне вайны са Швецыяй выклікала занепакоенасць у антыгабсбургскага блока. У лідэра французскай дыпламатыі кардынала А. Рышэльё ў 1629 г. ўзнікла ідэя далучэння Расійскай дзяржавы да антыгабсбурскай кааліцыі для нанясення ўдара па Рэчы Паспалітай, што цаклкам супадала з інтарэсамі Масквы. Ачуняўшая пасля перыяду Смуты Расійская дзяржава стала актыўна шукаць саюзнікаў, сярод якіх найбольш верагоднымі з'яўляліся Швецыя, Асманская імперыя і яе васал Трансільванія. Пасля перамогі пад Хоцінам асманы актыўна рыхтаваліся да працягу баявых дзеянняў і кааліцыя з Расійскай дзяржавай выглядала абсалютна заканамернай. Спробы польскай дыпламатыі утварыць антыасманскую кааліцыю ва ўмовах Трыццацігадовай вайны выглядалі фантастычнымі.

Знешнепалітычная лінія расійскай дыпламатыі напачатку 30–х гг. XVII ст. зводзілася да рэалізацыі трох асноўных задач: вярнуць Смаленшчыну, страчаную падчас вайны з Рэччу Паспалітай у 1609–1612 гг., забяспечыць выхад да Балтыйскага і Чорнага мароў і абараніць паўднёвыя межы дзяржавы ад набегаў Крымскіх ардынцаў. У той жа час Расійская дзяржава паспрабавала зблізіцца са Швецыяй, такім чынам, напрыканцы 20–х гг. XVII ст. урэшце аформіўся праект руска-шведска-французскага саюза, накіраванага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

супраць Рэчы Паспалітай. Аднак смерць шведскага караля Густава Адольфа ў 1632 г. сарвала патэнцыяльны расійска-шведскі саюз і палепшылі становішча Польска-літоўскай дзяржавы.

Тым не менш, Крэмль палічыў, што Расійская дзяржава ўжо валодае неабходнымі рэсурсамі, для ажыццяўлення мерапрыемстваў па дасягненню вышэй апісаных знешнепалітычных задач. разглядаць Смаленскую вайну 1632–1634 гг. паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, у выніку якой Варшава вымушана была пайсці на некаторыя саступкі Маскве [3, с. 44].

У 1632 г. Расія распачала г.зв. Смаленскую вайну, якую неабходна разглядаць у цеснай сувязі з Трыццацігадовай вайной. Асманская імперыя паспрабавала скарыстацца няпростым становішчам Рэчы Паспалітай і распачала супраць яе баявыя дзеянні. Улетку 1633 г. быццам бы без дазвола турэцкага султана сілістрыйскі паша атакаваў польскае (зараз украінскае – С.Ч.) Падолле. Каронная армія, аднак, здолела выцесніць асманаў за Днестр і перанесла баявыя дзеянні на асманскую тэрыторыю. Прысланыя на дапамогу татары Буджацкай арды таксама пацярпелі паражэнне. Польская армія разграміла асманаў і нават абвяшчэнне султанам Мурадам IV джыхада супраць Рэчы Паспалітай сітуацыі не змяніла.

Польска-літоўскай дыпламатыі ўдалося схіліць на свой бок Крымскае ханства, якое, хаця і з’яўлялася васалам асманскага султана, якое у 1633 г. здзейсніла набег на паўднёвыя землі Расіі. Паспяховыя баявыя дзеянні польска-літоўскага войска ў сукупнасці з набегам ардынцаў пад Маскву паставила расійскае войска ў цяжкае становішча. Разгром асманаў і капітуляцыя расійскай арміі прывялі да заключэння ў 1634 г. Палянаўскага міра, які фіксаваў узаемныя саступкі з боку Рэчы Паспалітай і Расіі перш за ўсё у пытанні тэрытарыяльных і дынастычных прэтэнзій.

Было зразумела, што ўмовы Палянаўскага міра носяць часовы характар. Расійскае кіраўніцтва праводзіла палітычную лінію, скіраваную на абгрунтаванне правоў Масквы на землі “Белай Русі”, у сувязі з чым любое аслабленне Рэчы Паспалітай было на карысць Расійскай дзяржаве. Маскоўскі ўрад уважліва сачыў за ўнутранымі супярэчнасцямі паміж кальвінісцкай шляхтай ВКЛ і іх каталіцкімі праціўнікамі, якіх падтрымлівала Польша. У ліпені 1648 г. луцкі ваявода дакладваў цару, што “ў палякаў з літвою розні няма, акрамя чаркаскай вайны” [7, с. 222]. Кіруючыя колы ў Варшаве і ў Вільні разумелі, што нестабільнасць у беларускіх і ўкраінскіх землях Рэчы Паспалітай была ў палітычных інтарэсах Масквы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У 1635 г. скончыўся тэрмін Альтмаркскага перамір'я і фармальна вайна Швецыі супраць Рэчы Паспалітай зноў пачалася. Шведам, якія ўжо адкрыта ўцягнуліся ў Трыццацігадовую вайну і Рэч Паспалітая, якая імкнулася арганізаваць антыасманскую кааліцыю было выгадна працягнуць становішча міра. У сувязі з гэтым абодва бакі пры пасярэдніцтве французскага дыпламата К. д'Аво пайшлі на заключэнне Штурмсдорфскага перамір'я тэрмінам на 26 з паловай гадоў. Ахвяраванне Уладзіславам IV сваімі правамі на расійскі і шведскі трон дало яму магчымасць засяродзіцца на падрыхтоўцы барацьбы супраць Асманскай дзяржавы.

Паражэнне Габсбургаў у Трыццацігадовай вайне вымусіла кіраўніцтва Рэчы Паспалітай пайсці на змены ў знешнепалітычным курсе і ў 1645 г. яно зрабіла крок да збліжэння з Францыяй, але на поўны разрыў з Габсбургамі, тым не менш, не пайшло. Не былі канчаткова ўрэгуляваны адносіны са Швецыяй, частка магнатаў якой на чале з канцлерам А. Аксеншэрнам выступала за працяг вайны. Швецыя ўжо ў 1646–1647 гг. была падрыхтавана да пачатку баявых дзеянняў супраць Рэчы Паспалітай.

Неспрыяльная для Рэчы Паспалітай сітуацыя склалася і на паўднёвых межах з Крымам і Асманскай імперыяй. Палітыка Уладзіслава IV, накіраваная на стварэнне антытурэцкай кааліцыі ўсходнееўрапейскіх дзяржаў, рабіла заканамернай варожасць Асманскай імперыі да Рэчы Паспалітай, што асабліва карысна было для Крымскага ханства, кіраўнік якога хан Іслам-Гірэй III імкнуўся выкарыстаць любую магчымасць, каб скарыстаць аслабленне польска-літоўскай дзяржавы. Разам з тым, правал ідэі паходу Рэчы Паспалітай на крымскіх татараў прывёў да незадавальнення значнай колькасці казацтва і, як вынік, узмацнення сацыяльных і этнаканфесійных супярэчнасцей у кароннай Украіне.

Трыццацігадовая вайна ў сукупнасці з названымі вышэй фактарамі аказала значны ўплыў на становішча ўласна запарожскага казацтва. На працягу ўсёй вайны тысячы запарожцаў прынялі ўдзел у баявых дзеяннях на тэрыторыі Еўропы – у Трансільваніі, Германіі, Аўстрыі, адзначыліся ў 1646 г. у бітве пад Дзюнкеркам, прычым апошні эпізод звязваецца з імем Б. Хмяльніцкага [8, с. 570]. Набыты ў Еўропе досвед не мог быць не выкарыстаны запарожскім казацтвам, тым больш што да 40-х гг. XVII ст. Запарожская Сеч фактычна пераўтварылася ў самакіруючую і практычна незалежную ад цэнтральных польскіх улад тэрыторыю, якая стала пераўтварацца ў суб'екта міжнародных адносін рэгіянальнага ўзроўню, аб чым сведчыць спроба стварэння ў 1624 г. казацка-татарскага вайсковага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

саюзу [9, с. 68]. Узмацненне нацыянальнай свядомасці рускага насельніцтва кароннай Украіны напрыканцы XVI – у першай палове XVII ст. разам з замацаваннем казацтва як магутнай сацыяльнай сілы сталі галоўнымі фактарамі зараджэння вызваленчай барацьбы на Украіне.

У канцы XVI – пачатку XVII ст. на Украіне адбылося шэсць буйных казацкіх паўстанняў (1591-1593 гг., 1594-1596 гг., 1625 г., 1630 г., 1637 г., 1638 г.), адно з якіх, пад кіраўніцтвам С. Налівайкі было прынесена ў беларускія паветы ВКЛ, дзе дзеянні казакаў былі актыўна падтрыманы часткаю мясцовага насельніцтва. Менавіта дзякуючы падтрымцы казакаў у 1633 г. быў адроджаны афіцыйны статус дызуніцкай праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Аднак гэтая падзея не толькі не стабілізавала становішча ў Польска-літоўскай дзяржаве, а наадварот прывяла да яе дэстабілізацыі.

Лідар запарожскіх казакаў Б. Хмяльніцкі пачаў пошук знешніх саюзнікаў – імі маглі быць натуральныя знешнепалітычныя праціўнікі Рэч Паспалітая – Расійская дзяржава і Крымскае ханства. Менавіта з апошнім новаабраны гетман найбольш актыўна вёў перамовы і, заручыўшыся падтрымкай Асманскай дзяржавы, да сярэдзіны сакавіка 1648 г у Бахчысараі быў заключаны дагавор аб саюзе з крымскім ханам Іслам-Гірэем аб вайсковай дапамозе татар ў барацьбе супраць Рэчы Паспалітай. Паводле казацка-татарскай дамоўленасці, запарожцы абяцалі не дапускаць марскіх выпраў супраць татарскіх і турэцкіх населеных пунктаў, рэгулярна выплочваць памінкі, за што на дапамогу Хмяльніцкаму было накіравана 3–4 тыс. татар на чале з Тугай-беем.

Такім чынам, у 20–40-х гг. XVII ст. ва Ўсходняй Еўропе праходзілі няпростыя геапалітычныя працэсы, на якія непасрэдны ўплыў аказвала Трыццацігадовая вайна ў Цэнтральный Еўропе. Рэч Паспалітая, Расійская дзяржава, Швецыя і Асманская імперыя вымушаны шукаць саюзнікаў на Захадзе, каб рэалізаваць свае інтарэсы ва Ўсходняй Еўропе. Складаная знешнепалітычная сітуацыя, у якой аказалася Рэч Паспалітая ў сярэдзіне XVII ст., стварыла спрыяльную кан’юктуру для актывізацыі апазіцыйных каралеўскаму ўраду сіл, што выявілася ў шэрагу паўстанняў запарожскіх казакаў на Украіне ў першай палове XVII ст. Нявырашанасць унутраных праблем у Рэчы Паспалітай прывяла да фарміравання на Украіне апазіцыйнага дзяржаўнага ўтварэння – Запарожскай Сечы, якая слаба кіравалася цэнтральнымі органамі ўлады. Як вынік, Усходняя Еўропа стала на парозе новага буйнога міжнароднага канфлікта, які

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прадвызначыў істотныя геапалітычныя змены ў другой палове XVII ст.

## Спіс крыніц і літаратуры

1. Лыжин, Н.П. Столбовскій договоръ и переговоры ему предшествующіе / Н.П. Лыжин – СПб.:б.в., 1856. – 243 с.; Шаскольский И.П. Столбовский мир 1617 г. и торговые отношения России со Шведским государством. – М.; Л.: Наука, 1964. – 218 с.

2. Снапкоўскі, У. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вуч. дапам. для студэнтаў: у 2 ч. – Мінск: БДУ, 2003. – Ч.1. Ад пачатку дзяржаўнасці да канца XVIII ст. – 281 с.; Алексеев, В.М. Тридцатилетняя война. – Л.: Учпедгиз, 1961. – 184 с.; Ивонина Л.И., Прокопьев А. Ю. Дипломатия Тридцатилетней войны. – Смоленск, 1996; История дипломатии / под ред. В.П. Потёмкина: в 3 т. Т. 1. – М.: ОГИЗ, 1941. – 567 с.; Поршнев, Б.Ф. Тридцатилетняя война и вступление в неё Швеции и Московского государства / Вебер, В.Г. – М.: Наука, 1976. – 436 с.; The Thirty Years' War / G. Parker. – 2. – New York: Routledge, 1997. – 316 p.; Schmidt, G. Der Dreißigjährige Krieg. – 6. – München: Beck, 2003; Schormann, G. Der Dreißigjährige Krieg. – 3. – Göttingen: Vandenhoeck und Ruprecht, 2004; Serczyk, W.A. Na płonącej Ukrainie. Dzieje Kozaczyzny 1648–1651, Warszawa 1998.

3. Поршнев, Б.Ф. К характеристике международной обстановки освободительной войны украинского народа 1648–1654 годов / Б.Ф. Поршнев // Вопросы истории. – 1954. – №5. – С. 44–58.

4. Сас, П.М. Укладнення Хотинского мирного договору 1621 р. // УІЖ. – 2013. – №2. – С. 38–73.

5. Донесение о посольстве князя К. Збаражского в Турцию. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.vostlit.info/ Texts/rus9/Zbarazskij/frametext1.htm – Дата доступу: 03.03.2016.

6. Kognowicki, K. Zywot Lwa Sapiehy/ K. Kognowicki. – Sanok: – 1856. – S. 97.

7. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссией (АЮЗР). – СПб.: тип. П.А. Кулиша, 1861. – Т. 3. – 604, 134, 22 с.

8. Полторак, В.М. Тридцятилітня війна / В.М. Полторак // Українсько козацтво: мала енциклопедія. – Київ, 2006. – С. 570–571.

9. Брехуненко, В. Московська держава і козацько-татарський віськовий союз 1624–1629 рр. / В. Брехуненко // Україна та Росія: проблеми політичних і соціокультурних відносин: збірник наук.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

праць. – Київ: Інститут історії України НАН України, 2003. – С. 66–84.

10. Історія України: нове бачення: У 2 т. / О.І. Гуржій, Я.Д. Ісаєвич, М.Ф. Котляр [та інш.]; редкол. В.А. Смолій (гол. ред.) [та інш.].– Київ: Вид-во “Україна”,1995. – Т. 1. – 350 с.

УДК 94(476)

**Е. В. Хроленок**
*БГУ, г. Минск*

## ГОМЕЛЬЩИНА И СТАРОДУБЩИНА: ИСТОРИЯ СОЦИАЛЬНО-ПОЛИТИЧЕСКИХ ВЗАИМООТНОШЕНИЙ

*В статье сделана попытка осветить общую историю двух пограничных регионов – Гомельщины и Стародубщины, через процесс зарождения и формирования в Северской земле социального сословия казаков. На основе малоизученных архивных документов уточняются вопросы установления границ между регионами во время войны Российского царства с Речью Посполитой (1654–1667).*

Территория исторической Стародубщины сегодня разделена между Российской Федерацией и Украиной, и лишь ее небольшая часть входит в состав Гомельской области Республики Беларусь. Однако продолжительный период ее история была неразрывно связана с Великим княжеством Литовским (ВКЛ). Стародуб и Гомель составляли единое целое, как два центра Северской земли.

Во второй половине XIV в. Северская земля, включая Гомель и Стародуб, была включена великим князем Ольгердом в состав ВКЛ. Стародуб стал центром удельного княжества, в котором правили представители династии Гедиминовичей. В середине XV в. Северщина с городами Стародуб и Гомель были пожалованы Казимиром Ягайловичем князю Ивану Можайскому.

Отличительной чертой данного региона являлось зарождение на его территории в конце XV – начале XVI вв. особой социальной прослойки – казачества. Сыгравшей впоследствии значительную роль в истории Северской земли. Полагаем, что основной причиной зарождения казачества в крае послужило его географическое положение. Северские земли находились на границе ВКЛ и Московского государства при этом подвергались постоянным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ